ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

# Школьная планета

*НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!* *№ 2* *Кастрычнік 2016*

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*

# Фінансавая граматнасць

## СПЕЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ




## ПРЫКАЗКІ ПРА ГРОШЫ

***Іншая пазыка - тая ж страта.***

***Хочаш ворага нажыць - пазыч грошай.***

***У пятніцу нічога нікому не пазычай.***

***Калі маеш грошы, то не будзеш хадзіць босы.***

***Хай грошай ні гроша, абы слава хароша.***

***Без гаспадара і грошай не трэба.***

***Хоць лай, а потым грошы аддай.***

***Грошы лёгка бяруцца, ды цяжка аддаюцца.***

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 2, кастрычнік 2016 г.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКІХ ГРОШАЙ




***На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь адзіным плацёжным сродкам прызнаецца беларускі рубель (код ISO — BYR, сімвал — Br).***

***У наяўным звароце выкарыстоўваюцца грашовыя банкноты, афіцыйна названыя разліковымі білетамі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.***

Пасля распаду СССР на тэрыторыі суверэннай Беларусі працягвалі “хаджэнне” грашовыя знакі, выпушчаныя Дзяржбанкам СССР, а затым — Цэнтральным банкам Расіі. Прататыпам нацыянальнай валюты сталі ***адразныя аднаразовыя купоны*** — аналаг папяровых грошай, уведзеныя ў дзеянне ў студзені 1992 года. Яны былі выпушчаны ў выглядзе карткі спажыўца для сумеснага звароту з савецкім рублём, з мэтай абароны ўнутранага спажывецкага рынку.




Грамадзяне Рэспублікі Беларусь атрымлівалі купоны (іх колькасць вызначалася ўсталяванымі нормамі спажывання) па месцы працы, вучобы або службы па прад'яўленні пашпарта з прапіскай.




Карткі спажыўца на дзяцей выдаваліся ў ЖЭСах, а пенсіянерам — разам з пенсіяй. У краме пры разліку за тавар пакупнік разам з грашыма перадаваў прадаўцу імянную картку спажыўца, адкуль той выразаў неабходную колькасць купонаў у залежнасці ад кошту пакупкі (купоны мелі розныя наміналы — 1, 3, 5, 10 і г. д. рублёў). Без купонаў набываць тавары можна было толькі па камерцыйных цэнах, якія ў некалькі разоў перавышалі дзяржаўныя.

*Купонная сістэма пратрымалася нядоўга — ужо ў канцы 1992 года карткі спажыўца не мелі ніякай каштоўнасці.*

У маі 1992 года Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь увёў у абарачэнне ***разліковыя білеты вартасцю 50 капеек, 1, 3, 5, 10, 25, 50 і 100 рублёў***. Яны павінны былі замяніць спажывецкія карткі, разглядаліся як шматразовыя купоны і выпускаліся ў якасці дапаўнення да савецкага, а затым — расійскага рубля, якія з'яўляліся асноўнай грашовай адзінкай. Але ў маі 1994 года Нацыянальны банк прыняў пастанову, якой была зацверджана нацыянальная валюта краіны — ***беларускі рубель***, і разліковыя білеты набылі статус адзінага законнага плацёжнага сродку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, які выкарыстоўваецца ў наяўным грашовым абароце.












*Першы час пакупніцкая здольнасць беларускага рубля была штучна завышана ў дзесяць разоў: банкнота заяўленая вартасцю 1 рубель у рэальнасці лічылася як 10 рублёў, 5-рублёвая купюра — 50 рублёў, і г. д. Такая палітыка праводзілася да 20 жніўня 1994 года, калі была праведзена дэнамінацыя нацыянальнай валюты, і фактычны намінал беларускіх рублёў зраўняўся з заяўленай вартасцю банкнот.*

**Дадзены выпадак унікальны тым, што для ажыццяўлення дэнамінацыі не патрабавалася замена грашовых купюр, якія знаходзяцца ў абароце.**

***Дом, у якім утульна ўсім!***

**berezino2.school.by** **vk.com/club59543714** ***№ 2, кастрычнік 2016 г.***

На банкнотах наміналам да 100 рублёў былі змешчаны прадстаўнікі ***беларускай фаўны***: белка (*50 капеек — упершыню з 1920-х гадоў на тэрыторыі Савецкага Саюза і экс-СССР з'явіліся папяровыя капейкі*), заяц (1 рубель), лось (25 рублёў), і інш.












Самая буйная на той момант беларуская купюра мела выяву зубра і намінал 100 рублёў, але ўжо ў снежні 1992 года выйшлі ў абарачэнне банкноты вартасцю ***200 рублёў і 500 рублёў***. Гэта былі першыя беларускія грошы, на якіх змешчаны не прадстаўнікі фаўны, а віды Мінска — Прывакзальная плошча і Плошча Перамогі.

*Money often costs too much (англ.)*

*“Часта грошы каштуюць занадта дорага”.*



Ральф Уолда Эмерсан - *амерыканскі эсэіст, паэт, філосаф, пастар, лектар, грамадскі дзеяч.*

У лістападзе 1993 года выпушчана ў абарачэнне банкнота вартасцю ***<u>1000 рублёў</u>***, а ў красавіку 1994 года — купюра наміналам ***<u>5000 рублёў</u>***.

Новыя грошы характарызаваліся павышанай ступенню абароны — металізаванай палоскай, якая знаходзіцца паміж рэльефным мікратэкстам і пластамі паперы.







28 снежня 1994 года Нацыянальны банк выпусціў у абарачэнне банкноту вартасцю ***<u>20 000 рублёў</u>***, якая адрознівалася не толькі нязвыкла высокім наміналам, але і павялічаным у параўнанні з іншымі купюрамі памерам.





Пасля змены ў 1995-м годзе Дзяржаўнага Герба Рэспублікі Беларусь на папяровых грошах знікла выява «Пагоня», на месцы якой з гэтага часу знаходзіўся намінал банкноты. Восенню таго ж года ў абарот пастуціла банкнота вартасцю 50 000 рублёў, а праз год — 100 000 рублёў, на якой *упершыню ў сусветнай грашовай гісторыі былі прадстаўлены жывыя людзі (артысты балета), якія не з'яўляюцца кіраўнікамі краіны*.

З 1998 па 1999 год па прычыне ўзмацнення інфляцыйных працэсаў Нацыянальны банк выпусціў банкноты вартасцю ***500 000, 1 000 000 і 5 000 000 рублёў***.


















У ***<u>студзені 2000 года была праведзена дэнамінацыя</u>***, у выніку якой намінал купюр зменшыўся ў тысячу разоў. Выявы на іх засталіся ранейшымі, але нязначна змянілася каляровае афармленне. Таксама з'явілася новая банкнота вартасцю 10 рублёў, якая знаходзілася ў звароце да сакавіка 2013 года (яна была выведзена з абароту разам з 20-рублёвай купюрай). У 2001-2002 гадах Нацыянальны банк выпусціў разліковыя білеты наміналам 10 000, 20 000 і 50 000 рублёў, з 1 студзеня 2004 года з абароту былі выведзены 1-рублёвыя банкноты. У ліпені 2005 года вывелі з абароту 5-рублёвую купюру, адначасова выпусціўшы банкноту вартасцю ***<u>100 000 рублёў</u>***.






*У сувязі са зменамі правілаў арфаграфіі беларускай мовы (замест «пяцьдзесят» трэба пісаць «пяцьдзясят») у 2010-м годзе адпаведным чынам быў адкарэкціраваны тэкст на 50-рублёвых і 50000-рублёвых купюрах.*




А ў 2012 годзе была выпушчана ў абарачэнне банкнота наміналам ***<u>200 000 рублёў</u>***.






*Not he who has much is rich, but he who gives much.*

*“Багаты не той, хто шмат мае, а той, хто шмат аддае”.*



Эрых Фром - *нямецкі сацыёлаг, філосаф, сацыяльны псіхолаг, псіхааналітык.*

# ЧЫТАЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

З 1996 года Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь перыядычна ўводзіць у абарачэнне металічныя грошы — ***памятныя манеты***, якія маюць сілу законнага плацёжнага сродку, але ў абароце не ўдзельнічаюць, паколькі іх фактычны кошт значна перавышае намінал.

З 1 ліпеня 2016 года ў Рэспубліцы Беларусь праводзіцца ***дэнамінацыя афіцыйнай грашовай адзінкі – беларускага рубля***. Адпаведнае рашэнне прынята Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 2015 года № 450.

ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына